# Літаратуразнаўства

І.А. ШВЕД

## СІМВОЛІКА ДЗІКАРОСЛЫХ ДРЭЎ У БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

На основе системного подхода с использованием историко-генетического и функционально-семантического методов выявляется специфика символики дикорастущих деревьев, представленных в белорусском фольклоре. Делается вывод: образы дикорастущих деревьев реализуют спектр значений, связанных с проявлениями космической и человеческой жизни в их взаимосвязи.

Being based on the systemic approach and historical-genetic and functional-semantic methods the research reveals specified symbolics of the Wild trees, presented in the Belarusian folklore. The Wild trees images realize a wide spectrum of meanings, connected with the manifestations of cosmic and man's life in their interrelationship.

Уводзіны. Актуальнасць тэмы вызначаюць нераспрацаванасць шы-рокага кола праблем, звязаных з даследаваннем знакавай арганізацыі свету пры дапамозе дэндралагічных сімвалаў, у тым ліку сімвалаў дзікарослых дрэў, накапленне багатага фактычнага матэрыялу, які ўтрымлівае звесткі па сімволіцы дзікарослых дрэў і чакае грунтоўнага сістэмнага вывучэння паводле новых напрацовак у галіне фалькларыстыкі, семіётыкі, этналінгвістыкі, культуралогіі і іншых гуманітарных навук, добрая захаванасць архаічных вобразаў дзікарослых дрэў і жывучасць звязаных з імі міфапаэтычных уяўленняў, што выразна адбілася ў розных відах мастацтва.

Сімвалы дзікарослых дрэў траплялі ў поле зацікаўленняў шэрагу даследчыкаў, якія выказвалі розныя меркаванні наконт генезісу (паходжання, станаўлення і развіцця) і семантыкі названых феноменаў. Так, праблему ўшанавання дрэў славянамі асэнсоўваў А. Ненадавец (гл. Ненадавец 1996). Разам з тым сімволіка дзікарослых дрэў, прадстаўленых у розных жанрах беларускага фальклору, не была предметам даследавання вучонага. Разглядаючы фальклорныя вобразы явара, ціса і вінаграду, Л. Салавей, звярнула ўвагу на тое, што «шэраг раслінных вобразаў, якія арганічна ўключаны ў беларускі фальклор, не выкліканы рэаліямі прыроднага асяроддзя, а прынесены здалёк, захаваны ў эпічнай памяці народа» (Салавей 1993, 126). Адным з такіх «экзатычных» дэндралагічных вобразаў з'яўляецца явар. «Філалагічны» бок сімволікі вобразаў некаторых дзікарослых дрэў аналізаваў Н. Гілевіч у грунтоўнай працы «Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Слова і вобраз». Комплекснаму вывучэнню дэндралагічнага кода беларускага традыцыйнага фальклору з выкарыстаннем матэрыялу славянскіх традыцый было прысвечана даследаванне аўтара «Дэндралагічны код беларускага традыцыйнага фальклору».

Цікавасць уяўляе выкананая ў рэчышчы кагнітыўнай лінгвістыкі праца М. Малохі «Фразеологизмы с концептом "дерево" в зеркале народной культуры (на материале восточнославянских и польского языков)». З вобразаў

дзікарослых дрэў М. Малохай былі разгледжаны дуб, вярба, бяроза, арэх, асіна, ліпа, каліна, вольха, рабіна ў аспекце іх адлюстравання ў фразеалогіі. Варта падкрэсліць, што ў выніку вывучэння семантыкі вобразаў дрэў у фразеалагізмах розных моў - у тым ліку беларускай - даследчыца прыйшла да высновы пра вялікую значнасць канцэпту дрэва ў структуры ўяўленняў чалавека пра макра- і мікракосмас (гл. Малоха 1998). Але функцыянальную сферу вобразаў дзікарослых дрэў ва ўсім жанравым універсуме беларускага фальклору М. Малоха не ўстанавіла. Асэнсоўваючы мастацтва слова як чыннік самасвядомасці, І. Чарота звярнуў увагу на адметнасці функцыянавання вобразаў дрэў у фальклоры і літаратуры. Асаблівае значэнне вучоны надае вобразу вярбы: «...вярба - і прадрэва, і найжывейшае, і найпрыхільнейшае, і найзвычайнейшае з дрэў. Што вылучалася ў кожным асобным выпадку, цяпер ужо нельга сказаць адназначна. Можна здагадвацца, што "цяністая вярба" неяк увасабляла душы (цені) продкаў і таму лічылася ахоўнай» (Чарота 1995, 134). У сувязі з даследаваннем сімволікі і семантыкі славянскіх міфалагем - у прыватнасці міфалагемы Жанчыны - І. Казакова ўказала на тое, што «...вобраз жанчыны (або дзяўчыны) часта параўноўваецца з бярозай, калінай, рабінай, птушкай. Прыгожая, стройная бярозка або рабіна звязана з лірычным вобразам дзяўчыны, што ўвасоблена, напрыклад, у беларускай вышыўцы» (Казакова 1999, 124-125). Адносна функцыянальнасці Касмічнага Дрэва прывядзём высновы Т. Шамякінай: «У большасці індаеўрапейскіх народаў, якія жылі ў лесе, цэнтрам свету, воссю свету было Прадрэва, або Касмічнае Дрэва, якое злучала цэнтр Пекла, цэнтр Зямлі і цэнтр Неба» (Шамякіна 2000, 32).

Адзначым, што многія пытанні, звязаныя з даследаваннем сімвалаў дзікарослых дрэў як спецыфічным культурным (этнаграфічным, філалагічным, мастацтвазнаўчым, рэлігійным) феноменам, засталіся не дастаткова вывучанымі і, у прыватнасці, адсутнічае спецыяльнае даследаванне сімволікі дзікарослых дрэў у беларускім фальклоры. Таму мэта артыкула - вызначэнне асаблівасцей сімволікі дзікарослых дрэў, прадстаўленых у беларускім фальклоры - дасягаецца праз вырашэнне наступных задач: вызначэнне набору прыкмет, функцый і матываў, уласцівых сімвалам дзікарослых дрэў, мадэліраванне сістэмы розных сэнсавых варыяцый, назапашаных фальклорнымі сімваламі дуба, сасны, асіны і іншых дзікарослых дрэў.

**1. Свет дзікарослых дрэў у беларускім фальклоры.** Аднымі з найважнейшых прыкмет вобразаў дрэў у выпадку дыскрэтызацыі іх сферы ў народнай класіфікацыі з'яўляецца прыналежнасць да дзікарослых ці акультураных. У беларускай вуснай народнай творчасці даволі шырока прадстаўлены вобразы такіх дзікарослых дрэў, як дуб, явар, клён, ясень, ліпа, бяроза, вярба, каліна, рабіна, таполя, ляшчына, вольха, сасна, яліна, асіна і некаторыя іншыя. Дрэвы, плады якіх ужываюцца ў ежу і якія растуць у антрапагенным асяроддзі, надзяляюцца выразнымі прыкметамі *свайго,* культуры і ў традыцыйнай карціне свету беларусаў адносяцца да *добрых* дрэў (яблыня, вішня і толькі часткова - груша (верагодна, акультураная)). Падобную аксіялагізацыю ў шэрагу кантэкстаў маюць дуб, клён і ліпа. Але ліпа, як і іншыя дрэвы, якія растуць па-за антрапагенным асяродкам, не маюць ядомых пладоў (бяроза, сасна, яліна, вярба), надзелена прыкметамі *чужога,* дзікага і з'яўляецца локусам іншасветных істот. На мяжы свайго і чужога светаў размяшчаюцца дрэвы з ядомымі пладамі (па гэтай прыкмеце набліжаныя да акультураных), якія, як правіла, лакалізаваны па-за межамі культурней прасторы (па гэтай прыкмеце аднесеныя да дзікіх), - каліна, груша, ляшчына, дуб. Негатыўную семантыку (і разам з тым апатрапейнае значэнне) звычайна выяўляюць няплодныя і калючыя дрэвы, якія растуць у чужым свеце, -асіна, таполя і толькі часткова - вярба, груша, рабіна. Прадуктыўная сім-воліка ўласціва як дзікарослым, так і акультураным дрэвам (акрамя асіны). Дзікарослым дрэвам адводзіцца спецыяльная роля апякунства над хатай

і яе гаспадарамі, а таксама свойскай жывёлай і акультуранымі раслінамі. Асабняком стаяць асіна (далучаная да іншасвету) і экзатычнае для сучаснай Беларусі дрэва - явар, які займае адно з найвышэйшых месцаў у архаічнай дэндралагічнай іерархіі.

Дзікарослыя дрэвы функцыянуюць у якасці рэпрэзентатыўных тапаграфічных і ацэначных знакаў: маркіруюць, размяжоўваюць пэўныя сферы светабудовы. Яны ўваходзяць у кумулятыўныя ланцужкі частак прасторы, праз якія пераходзіць увасобленае зло, выгнанае з чалавечага свету, у *той* свет. І наадварот, праз пасрэдніцтва дзікарослых дрэў у чалавечы свет трапляе неабходная прыродна-касмічная энергія. Само выкарыстанне вобраза дзікарослага дрэва ў вусна-паэтычных творах, напрыклад у замовах, абрадавых песнях, надае ім выразныя рысы касмалагічнасці: у такіх тэкстах звычайна фігуруе «лабірынтны» вобраз светабудовы, разам з дрэвам выступаюць астральныя сімвалы, сусветная рака ці мора-акіян, гара ці «алтарны» камень і персанажы - увасабленні трох вертыкальных ярусаў светабудовы. Як правіла, такія тэксты змяшчаюць зварот да сакральных сіл іншасвету, ад якіх можна атрымаць пэўную дапамогу, асабліва неабходную ў так званыя пераходныя перыяды: у новы год, сезон, ва ўзроставую, шлюбную, сацыяльную групы і да т. п. Звяртае на сябе ўвагу ўстаноўка (напрыклад, у замовах) на магчыма поўны пералік прадметнага складу дзікарослых дрэў і дэтальная распрацаванасць гэтай групы сімвалаў, што сведчыць пра іх надзвычайную архаічнасць: *«Сыйдзі, каўтун, на дубочак, на кляночак, на Яварочак; сыйдзі, каўтун, на хвоячку, на елачку, на бярозачку; сыйдзі, каўтун, на лясіначку, на лозачку, на бруснічачку...»* (Замовы 2000, 246). Вызначым сімволіку некаторых дамінантных вобразаў беларускага традыцыйнага фальклору.

**2. Сімволіка дуба.** У беларускім фальклоры сваімі касмічнымі функцыямі, звязанымі са светаўладкаваннем, асабліва вылучаюцца дзікарослыя «мужчынскія» дрэвы - дуб і явар. Пры гэтым дуб, як прататыпнае дрэва, ключавы элемент дэндралагічнай сімвалічнай сістэмы, увасабляе ўсе асноўныя рысы сімволікі дрэў у цэлым. У кантынууме старажытных уяўленняў пра свет вобраз дуба - рэпрэзентант Сусветнага дрэва - выконваў медыятыўную функцыю «прагрэсіўнага пасрэдніцтва» (К. Леві-Строс), звязваўся з архетыпнымі ўяўленнямі пра стварэнне свету, што адлюстравалася ў адпаведных фальклорных матывах дуба з яго фундаментальней сімволікай жыцця, смерці і новага адраджэння. Медыятыўная характарыстыка дуба дазваляе ўстанавіць характар узаемадачыненняў паміж рэаліямі розных кодавых сфер, пры дапамозе чаго мадэліруецца цэласнасць і пераемнасць свету, выяўляецца ідэя цыклічнасці, колазвароту жыцця. У капядках, замовах, загадках дуб выступав знакам ключавога месца-часу, сімвалам касмічнай арганізацыі, сродкам мадэліравання касмічных пераходаў. У такім кантэксце ён успрымаецца як дрэва лесу, у сувязі з чым рэалізуе спектр значэнняў, далучаных да праяў касмічнага і чалавечага жыцця ў іх узаемасувязі. Як дрэва, якое дае плады, што выкарыстоўваліся ў ежу свіннямі і нават людзьмі, дуб надзяляецца прадуктыўнымі, ахоўнымі і іншымі спрыяльнымі для чалавека магчымасцямі, знаходзіцца блізка да мяжы культурнага, сацыяльнага. У гэтым сэнсе ён супастаўляльны з ляшчынай (арэхам). У казках дуб - носьбіт векавой мудрасці, пасрэднік, які дапамагае герою нейтралізаваць адмоўнае ўздзеянне *sacrum* і актуалізаваць яго станоўчыя моманты, перавесці іх у сферу чалавечага (атрыманне інфармацыі, якая прыводзіць да здзяйснення мэты, расчароўвання, а таксама набыццё чароўных сродкаў, багацця). Светапогляднай глыбіннай семантыкай вобраза дуба з'яўляецца яго суаднесенасць з родам, сям'ёй. Станы дуба, як і дрэў, што з ім выступаюць, іх «паводзіны» (цвіценне, сашчапленне, зліпанне лістоў, спляценне галін) выяўляюць пачуцці людзей (вечнае каханне).

**3. Сімволіка явара.** Экзатычнае для сучаснай Беларусі дрэва - явар займае адно з найвышэйшых месцаў у архаічнай дэндралагічнай іерархіі

і згодна з народнай шкалой каштоўнасцей ацэньваецца па вышэйшым рахунку. Явар як даўгавечнае, трывалае дрэва велізарных памераў у народных уяўленнях надзяляецца здароўем, рэпрэзентуе Сусветнае дрэва і лічыцца шчаслівым Дрэвам жыцця. У песенных тэкстах вобраз цудоўнай міфалагічнай мядовай ракі падкрэслівае шчаслівасць, *«трохугодлівасць»* явара-Сусветнага дрэва. Упарадкаванне свету, звязанае з вобразам явара, можа выяўляцца ў вялікіх маштабах і адбывацца ў межах касмагенезу. У вусна-паэтычных творах са шлюбна-эратычнымі матывамі явар, як і дуб, асацыіруецца з жаніхом ці родным братам дзяўчыны. У абрадавых і неабрадавых лірычных песнях, галашэннях сімвал явара выяўляе значэнні 'хлопец', 'малады мужчына ў росквіце сіл', 'бацька', 'памерлы гаспадар', 'мужчынскі лёс', 'невычэрпнасць кахання і жыцця ўвогуле', 'здароўе', 'дабрабыт', 'высокі сацыяльны статус', 'справядлівасць, асвячоная сакральнымі сіламі' і да т. п.

**4. Сімволіка ліпы.** У вусна-паэтычнай творчасці беларусаў ліпа - сімвал дабрабыту, жаноцкасці, мяккасці, падатлівасці. Існаваў міф пра паходжанне людзей ад ліпы. У казцы пра Пiлiпку дзед вычасаў з ліпавага паленца чурбачок, баба паклала яго ў калыску і стала калыхаць. З чурбачка вырас хлопчык Пiлiпка. Сувязь ліпы з імем Піліп характэрна і для некаторых песень і прымавак *(«Сядзеў бы, пане Піліпе, сабе ў ліпе»).* Гэтае дрэва суадносіцца з жаночым пачаткам і выступав парай да «мужчынскіх» дрэў явара ці дуба. У некаторых баладах з матывамі пасмяротнага ператварэння закаханых у дрэвы на жаночай магіле расце *ліпушка маладзенька,* якую дастае явар ці дуб, прабіваючы сцяну. Апісанне ліпы мае рысы ўзвелічэння, захаплення гэтым дрэвам. Выяўляе медыятыўнае значэнне ліпа, якая злучае неба з зям-лёй, той свет з гэтым, што адпавядае функцыям Сусветнага дрэва. Трады-цыя аднясення да ліпы падзей, важных для жыцця чалавека і грамадства, паступова набыла эстэтычны характар і фармалізавалася.

**5. Сімволіка асіны.** Міфапаэтычнае асэнсаванне асіны як дрэва *ніжняга* свету, звязанага са смерцю, з *нячыстымі* памерлымі, дэтэрмінавала сэнсавае напаўненне вобраза асіны ў лірычных песнях. У іх яна асэнсоўваецца як дрэва, звязанае з няшчасцем, і ў большасці выпадкаў выклікае адмоўныя эмоцыі. Вобраз надзвычай схільнай да знешніх уздзеянняў асіны параўноўваецца з безабаронным сіроцтвам. Дрыжанне лістоты асіны (= прыродная паралель нявесты) перадае ўзрушаны стан маладой у час вяселля. Вельмі часта паэтычная традыцыя акцэнтуе ўвагу на горычы асінавай драўніны, якая асацыіруецца з горыччу жаночага жыцця. У песнях сямейна-бытавой тэматыкі з горкай асінай параўноўваюцца чужыя жонкі. У беларускай Фальклорнай традыцыі вобраз *асіннічка* ўзнікае ў сітуацыі, калі размова ідзе пра разлуку дачкі і маці: горкім асіннічкам зарастуць дарожкі, якія звязвалі родных людзей. Сувязь асіны з разлукай, са смерцю, з іншасветам у традыцыйным асэнсаванні была настолькі моцнай, што нават у жартоўных песнях яе сімвал трывала суадносіцца з адмоўнымі праявамі чалавечага жыцця.

**6. Сімволіка сасны.** Сасна традыцыйна звязана з многімі элементамі свету і выконвае ў фальклоры шэраг сімвалічных функцый. Гэтае дрэва карэлюе з вадой і агнём. Так, у чарадзейнай казцы ўся вада сабрана пад сасной, *«і калі яе вывернуць, вады будзе колькі трэба»* (Чарадзейныя казкі 1978, 449). Пад гэтым дрэвам можа захоўвацца скарб. Прычым свае вогненныя ўласцівасці ён перадае і дрэву: стукнеш па сасне сякерай - са ствала іскры ляцяць, сыплецца золата; ссекчы дрэва немагчыма. Сасна належыць да групы дрэў, што прадстаўляюць жаночую іпастась Сусветнага дрэва, сімвалізуюць жаночы пачатак, дзяўчыну, маладую жанчыну, свякроў і перадаюць іх душэўны стан. У песнях з любоўна-шлюбнымі матывамі сасна абазначае лімінальны стан дзяўчыны, якая пераходзіць у катэгорыю жанчын. Зялёнае летам і зімой дрэва асацыіруецца з вясёлымі нявестай ці старшай дружкай. У сямейна-бытавых песнях тонкая і высокая сасна нярэдка з'яўляецца паралеллю нешчаслівай дзяўчыны, якую рана аддалі замуж. Схіленне сасны

на мора карэлюе з гаротным дзявочым (жаночым) лесам. У сімволіцы сасны асаблівую ролю адыгрывае яе пошум, скрып. Яны не толькі сімвалізуюць дэпрэсіўны, трывожны стан дзяўчыны або маладой жанчыны, але і выклікаюць і ўзмацняюць гэтыя пачуцці: *«Не шумі ты, сосна, // А мне так з гора тошна. //Не шумі, зялёна, //А мне й так невясёла»* (Радзіны 1998, 416). У беларускіх парэміях і прадказаннях сасна абазначае чалавека ўвогуле, безадносна да яго полу і ўзросту. Сасна, як і ліпа, бяроза, уваходзіць у кола аб'ектаў, праз якія героі вусна-паэтычных твораў перажываюць змены.

Заключэнне. Нягледзячы на размыванне сістэмы архаічных вераванняў, група міфалагізаваных вобразаў дзікарослых дрэў па-ранейшаму ўяўляе сабой значны фрагмент жывой фальклорнай традыцыі. За відавочнай шматаспектнасцю сімволікі дзікарослых дрэў, разнастайнасцю адносін паміж вобразамі выяўляецца іх устойлівасць і вычляняецца некалькі варыянтаў мадэліравання вобразаў дрэў, акцэнтаванне тых ці іншых змястоўных момантаў якога вымагаецца патрабаваннямі паэтыкі. У адносінах да вобразаў дзікарослых дрэў умоўна можна вылучыць «сакральна» і «прафанна» арыентаваныя версіі іх выявы ў беларускім фальклоры. У першым выпадку дрэва структуруе сусвет, выконвае медыятыўныя функцыі, з'яўляецца маркёрам сакральнай прасторы-часу, кадзіруе лічбавыя, этыялагічныя, генеалагічныя, аксіялагічныя структуры, рэпрэзентуе цесна звязаныя, узаемадапаўняльныя ў міфапаэтычным мысленні канцэпты нараджэння-тварэння, пладавітасці, вітальнай сілы, смерці-дэструкцыі і абнаўлення-адраджэння. У другім выпадку - найчасцей з'яўляецца спадарожнікам долі чалавека, вызначальнікам лесу, перадае ўласцівасці псіхікі, а таксама выяўляе чалавека як істоту плоцевую.

Прапанаванае даследаванне можа стаць звяном у вырашэнні праблем узнаўлення фальклорнай мадэлі свету старажытных славян. Перспектыва даследавання сімвалічнай мовы фальклору звязана з усведамленнем цэласнасці народнай традыцыі. Безумоўна, патрабуецца распрацоўка дасканалай методыкі параўнальных даследаванняў, прымяняльнай да любой славянскай народнай традыцыі, сістэматызацыі адпаведных матываў і сімвалаў. Мэтай падобных даследаванняў можа стаць аб'ёмная інтэгральная рэканструкцыя сімвалаў славянскай культуры як асобнай макрасістэмы, рэканструкцыя народнага мыслення ў цэлым, супастаўленне славянскай фальклорнай традыцыі з традыцыямі іншых народаў. Такая праца павінна быць комплекснай як паводле спалучэння розных метадаў і прыёмаў апісання, так і паводле ўключэння фалькларыстычнай праблематыкі ў больш шырокае кола культуралагічных праблем. Адзначаныя перспектывы і пераходы адкрываюць прынцыпова адметныя, шырэйшыя магчымасці вывучэння сімволікі не толькі ў рамках фальклору, народнай культуры ў цэлым, але і ў межах сістэмных ведаў.

ЛІТАРАТУРА

Замовы / Уклад. Г.А. Барташэвіч. 2-е выд. Мн., 2000.

Казакова І.В. Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыяле беларускага фальклору). Мн., 1999.

Малоха М . Фразеологизмы с концептом «дерево» в зеркале народной культуры (на материале восточнославянских и польского языков). Мн., 1998.

Ненадавец А.М. Каму пакланяліся продкі. Мн., 1996.

Радзіны. Абрад. Песні / Уклад. Г.А. Пятроўскай, апіс. абрадаў Т.І. Кухаронак. Мн., 1998.

Салавей Л.М. Вытокі песеннай вобразнасці фальклору ўсходніх славян // Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян / Л.П. Барабанава [і інш.]; Пад рэд. К.П. Кабашнікава, А.С. Фядосіка. Мн., 1993. С. 24-137.

Чарадзейныя казкі: У 2 ч. / Склад. К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч. Мн., 1973-1978. Ч. 2.1978.

Чарота І. А. Пошук спрадвечнай існасці:. Беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння. Мн., 1995.

Шамякіна Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы). Мн., 2000.

Швед І. А. Дэндралагічны код беларускага традыцыйнага фальклору. Брэст, 2004.

Паступіў у рэдакцыю 11.01.06.

***Іна Анатольеўна Швед*** - кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна.